
Выдаецца з 16 студзеня 1998 г.
Галоўны рэдактар Ігар Гермянчук
Заснавальнік Павел Жук
Выдавец — рэдакцыя газеты НАВІНЫ
Наклад 16 270.
Адрас для карэспандэнцыі:
220088, г.Мінск,вул. Іванаўская, 56.
Тэл/факс: 236-24-41

НАВІНЫ



Пятніца, 27 лютага 1998 г. № 19 Кошт свабодны

СВАБОДА

Забаронена 24 лістапада 1997 г.

Суд над Лабковічам і Шыдлоўскім ператварыўся ў шоу

Так лічыць Міжнародны Хельсінкскі камітэт па правах чалавека

Міжнародны Хельсінкскі камітэт па правах чалавека (*Human Rights Watch*) выступіў з пратэстам супраць судзілішча над Аляксеем Шыдлоўскім і Вадзімам Лабковічам. Міжнародная праваабарончая арганізацыя лічыць, што суд ператварыўся ў звычайнае шоу, а вынесены прыгавор — насмешка над правасуддзем. Як адзначаецца ў заяве, *«галоўная мэта гэтага шоу — забараніць беларускай моладзі выказваць свой пратэст існуючаму рэжыму. У большасці краінаў, нават там, дзе толькі дэкларуецца вяршэнства закона, самае большае, чым могуць пакараць такіх юнакоў, — гэта папярэдзіць іх альбо накласці штраф».*

«Беларусь усё болей і болей нагадвае Савецкі Саюз у яго найгоршых праяўленнях, у тым ліку і ў тым, што датычыцца рэпрэсіяў. Суд над Лабковічам і Шыдлоўскім яскрава даказвае гэта», — гаворыцца ў заяве *Human Rights Watch*.

Расціслаў **ПЕРМЯКОЎ**

Талкачова вярнулі. На чарзе Пашкевіч

Патэлефанаваўшы ўчора ў прэс-службу адміністрацыі прэзідэнта, мы нечакана даведаліся, што Валерый Талкачоў *«тут ужо не працуе».*

Прэзідэнцкі прэс-сакратар вярнуўся *«туды, адкуль прыйшоў»* — у Мінскі педагагічны універсітэт. В.Талкачоў трапіў на прэзідэнцкую службу з пасады дацэнта, а вярнуўся ва універсітэт прарэктарам па вучэбнай рабоце і замежных сувязях.

Чарговыя кадравыя перастаноўкі ў прэзідэнцкай адміністрацыі, мяркуючы па ўсім, толькі пачынаюцца. Відавочна, што з Карла Маркса, 38 будуць «выстаўленыя» яшчэ некалькі чыноўнікаў. Наступным кандыдатам на перамяшчэнне называюць «удачлівага» Івана Пашкевіча, які займае пасаду намесніка кіраўніка адміністрацыі. Іван Пашкевіч спаўна адыграў сваю ролю ў «справе Шарамета» і цяпер ён практычна не патрэбны. Кажуць, што хістаецца крэсла і пад кіраўніком адміністрацыі прэзідэнта Міхаілам Мясніковічам. У кадравай управе адміністрацыі пакуль не называюць прэтэндэнтаў на перамяшчэнне. Мяркуючы па лёсе В.Талкачова, усе чыноўнікі будуць добра ўладкаваныя.

Алесь **ДАШЧЫНСКІ**

Назіральная група АБСЕ прыступае да працы ў Беларусі

АБСЕ: з чаго пачаць?

Сёння ў Мінску адбудзецца афіцыйнае адкрыццё прадстаўніцтва Арганізацыі па бяспецы і супрацоўніцтву ў Еўропе.

З гэтай нагоды ў сталіцу Беларусі прыбывае дзеючы старшыня АБСЕ, міністр замежных справаў Польшчы Браніслаў Герэмэк. Старшыню суправаджаюць Генеральны сакратар АБСЕ Жанкарло Арагона, а таксама шэраг іншых высокапастаўленых асобаў. На цырымонію адкрыцця цэнтра АБСЕ запрошаны прадстаўнікі ўладаў і апазіцыі, грамадскія дзеячы і журналісты.

Падчас аднадзённага знаходжання ў Мінску Браніслаў Герэмэк сустрэнецца з прэм'ер-міністрам Сяргеем Лінгам, міністрам замежных справаў Іванам Антановічам і, магчыма, з прэзідэнтам Аляксандрам Лукашэнкам.

Напярэдадні візіту ў Мінск спадар Герэмэк заявіў журналістам: *«Мы павінны быць адкрытымі ў дачыненні да Беларусі, не пагаджаца на самаізаляцыю. Разам з тым мы не можам забывацца на асноўныя прынцыпы: правы апазіцыі на дзейнасць, свабода слова, свабода СМІ — гэта важны элемент міжнароднага ладу»,* — падкрэсліў Герэмэк.

Алесь **ДАШЧЫНСКІ**

Беларускі Народны Фронт звярнуўся да старшыні АБСЕ Браніслава Герэмэка з просьбай затрабаваць ад беларускіх уладаў вызвалення ўсіх палітвязняў.

На думку БНФ, *«прадстаўніцтва АБСЕ павінна абумовіць сваю далейшую прысутнасць у Беларусі і любыя кантакты з беларускім кіраўніцтвам безумоўным і неадкладным вызваленнем усіх палітычных вязняў. Гэта найперш 19-гадовы Аляксей Шыдлоўскі, засуджаны на паўтарагадовае зняволенне за надпісы на сценах, і 21-гадовы Вадзім Кабанчук, які ўжо паўгода знаходзіцца ў турме за ўдзел у дэманстрацыях»,* — гаворыцца ў звароце да старшыні АБСЕ.

Акрамя таго, Народны Фронт лічыць, што прадстаўніцтва АБСЕ павінна рашуча дамагацца ад пануючага ў Беларусі рэжыму выканання элементарных дэмакратычных нормаў: спынення палітычнага праследу; скасавання ўсіх крымінальных і адміністрацыйных прысудаў і спынення справаў, вынесеных і ўзбуджаных супраць апанентаў рэжыму за палітычную і грамадскую дзейнасць; спынення праследу незалежнай прэсы, адмены рашэнняў аб закрыцці газеты СВАБОДА і Радыё 101,2; стварэння плюралістычнай грамадскай наглядальнай камісіі нацыянальнага тэлебачання і радыё, якая забяспечыць роўны доступ палітычных сілаў да дзяржаўных электронных мас-медыя; адмены антыканстытуцыйных актаў, якія абмяжоўваюць свабоду слова, сходаў і дэманстрацыяў; спынення дыскрымінацыі беларускае мовы ў адукацыі і дзяржаўным сектары.

Толькі выкананне пералічаных вышэй умоваў, на думку БНФ, магло б стварыць умовы для правядзення ў Беларусі дэмакратычных выбараў. Усякія іншыя выбары пры дыктатуры заведама будуць антыдэмакратычным спектаклем і не павінны прызнавацца міжнароднай супольнасцю.

Мікола **ГРЫНЯВІЦКІ**

Браніслаў Герэмэк з першым візітам у Беларусь



Браніслаў Герэмэк (на здымку) — міністр замежных справаў Польшчы. З 1 студзеня 1998 г. — дзеючы старшыня АБСЕ.

Нарадзіўся 6 сакавіка 1932 г. у Варшаве, скончыў гістарычны факультэт Варшаўскага універсітэта. У сярэдзіне 60-х атрымаў 3-гадовую навуковую стыпендыю ў Ecole Pratique des Hautes Etudes (Парыж), у сярэдзіне 70-х — 2-гадовую стыпендыю ў ЗША. У 1960 г. абараніў дысертацыю і атрымаў ступень доктара навук, з 1989 г. прафесар. У 1955—1960 і ў 1965—1980 гг. працаваў у якасці навуковага супрацоўніка ў Інстытуце гісторыі ПАН, у 1962—1965 выкладаў у Сарбоне (Парыж). На працягу 15 гадоў кіраваў навуковай лабараторыяй культуры Сярэднявечча, у 1985 г. быў звольнены па палітычных матывах; у далейшым быў рэпрэсіраваны (арышты, вобыскі, адмовы ў выездзе за мяжу). З першых дзён зараджэння «Салідарнасці» і на працягу многіх гадоў быў экспертам і дарадцам незалежнага прафсаюза, стаяў на чале групы дарадцаў лідэра прафсаюза Леха Валенсы. Удзельнік Круглага стала (1989 г.). Абіраўся дэпутатам Сейма РП 1-й, 2-й і 3-й кадэнцыі. На працягу дзвюх кадэнцыяў Сейма ўзначальваў парламенцкую камісію замежных справаў (1991—1993 і 1993—1997). З'яўляецца членам польскага і французскага PEN-Клуба.

Антановіч казаў праўду

Не так даўно міністр замежных справаў Беларусі Іван Антановіч казаў, што некалькі еўрапейскіх краінаў праяўляюць зацікаўленасць у далучэнні да Саюза Расіі і Беларусі. Першы сігнал ёсць.

Як паведамляе Інтэрфакс, так званы Саюз абаронцаў Прыднястроўя звярнуўся да Аляксандра Лукашэнкі і Барыса Ельцына з просьбай аб уваходжанні ў Саюз. У дакуменце сцвярджаецца, што толькі ўступленне Прыднястроўя ў гэтую арганізацыю можа быць гарантам бяспекі і адзіным прымальным варыянтам урэгулявання прыднястроўскага канфлікту.

Дзеячы незаконна абвешчанай Прыднястроўскай рэспублікі працягваюць перамовы з Кішынёвам наконт вызначэння афіцыйнага статусу Прыднястроўскага рэгіёна, але яўна не намераны вырашаць канфлікт цывілізаваным шляхам.

М.Н.

Вандалізм у цэнтры Мінска

Акт вандалізму быў учынены на гэтым тыдні на Вайсковых могілках у Мінску

Невядомыя злачынцы апаганілі 49 пахаванняў савецкіх воінаў часоў Другой сусветнай вайны і цывільных грамадзянаў. Па словах работнікаў гарадской камунальнай службы, якія даглядаюць могілкі, раніцай пасля святкавання Дня Узброеных Сілаў яны налічылі 12 вырваных з зямлі крыжоў і перавернутых надмагільных плітаў, а наступнай ноччу было разбурана яшчэ 37 помнікаў. Супрацоўнікі Савецкага райаддзела міліцыі лічаць, што злачынства здзейсніла хутчэй за ўсё падлеткі-хуліганы і ніякага палітычнага падтэксту ў гэтай справе няма. Будзем спадзявацца, што распачатае следства выявіць сапраўдных злачынцаў.

Альгерд **НЕВЯРОЎСКІ**

Ці пашанцуе гэтаму хлопчыку?

У Бабруйску маладая жанчына, заражаная вірусам СНІДу, нарадзіла дзіця.

Пакуль яшчэ дакладна невядома, ці перадалася інфекцыя нованароджанаму. Медыкі назіраюць за хлопчыкам. Першыя аналізы на ВІЧ-інфекцыю далі адмоўныя вынікі, але ўсё роўна ёсць высокая рызыка таго, што вірус перадаўся сыну ад маці. Існуе таксама небяспека заражэння праз грудное малако.

Бабруйск у Магілёўскай вобласці — самы небяспечны горад у плане СНІДу. Тут зафіксавана 27 выпадкаў ВІЧ-інфекцыі. Прычым толькі 5 чалавек заразіліся палавым шляхам, астатнія — праз брудныя шпрыцы пры ін'екцыі наркотыкаў.

Сымон **ГЛАЗШТЭЙН**

Сацыялагічнае апытанне

Што трывожыць беларусаў

Найбольшую трывогу ў жыхароў нашай краіны выклікаюць нізкі ўзровень жыцця, крыміналізацыя грамадства і наступствы чарнобыльскай катастрофы.

Як паказала апытанне жыхароў нашай краіны, праведзенае Інстытутам сацыялогіі Акадэміі навук, найбольшую трывогу выклікае нізкі ўзровень жыццезабеспячэння і зніжэнне рэальнай заработнай платы (78,9% апытаных). Колькасць людзей, у якіх матэрыяльнае становішча не выклікае заклапочанасці, склала толькі 3,4%!

Другое месца сярод фактараў, якія выклікаюць трывогу ў людзей Беларусі, займае рост злачыннасці (74,5%). Прычым крыміналізацыя грамадства непакоіць у аднолькавай ступені як «багатых», так і «бедных». Наступствамі аварыі на Чарнобыльскай АЭС сур'ёзна заклапочаныя 74,2% рэспандэнтаў, у некаторай ступені — 21,6% і толькі 3% апытаных ніяк не хваляюцца наступствы чарнобыльскай катастрофы.

БелаПАН

У Старавойтава інсульт

Былы старшыня «Рассвета» Васіль Старавойтаў, які ўжо больш за тры месяцы ўтрымліваецца ў следчым ізалятары КДБ, перажыў мікраінсульт.

Па словах адваката Валерыя Ярчака, Старавойтаў траціў прытомнасць, не мог рухацца і гаварыць, ён просіць, каб яго стан здароўя абследаваў акадэмік Ігнацій Антонаў.

Адвакат раcпавёў нам, што В.Старавойтаў моліцца па тры гадзіны на дзень. Валерый Ярчак мяркуе, што да пачатку сакавіка былога старшыню «Рассвета» выпусцяць з камеры, бо «усе следчыя дзеянні скончаныя».

Алесь **ДАШЧЫНСКІ**

Еўрапейскія дэмакраты – за дэмакратыю ў Беларусі

«Аўтарытарны рэжым Лукашэнкі дэманстратыўна ігнаруе пазіцыю еўрапейскай супольнасці», — гаворыцца ў заяве, прынятай удзельнікамі міжнароднай канферэнцыі «За дэмакратыю ў Беларусі».

Канферэнцыя праходзіла ў Вільні 21—22 лютага. Яе ладзіў Еўрапейскі дэмакратычны саюз — арганізацыя, якая аб'ядноўвае шэраг ліберальных і кансерватыўных партыяў Еўропы, многія з якіх з'яўляюцца ў сваіх краінах правячымі (напрыклад, у Францыі і Нямеччыне).

Нашую краіну, праблемам якой і была прысвечаная канферэнцыя, прадстаўляла Аб'яднаная грамадзянская партыя (16 дэлегатаў). Яны падрабязна распавялі пра палітычную і эканамічную сітуацыю ў Беларусі, пра масавыя парушэнні правоў чалавека, палітычныя рэпрэсіі, арышты і штрафы. Генеральны сакратар Еўрапейскага дэмакратычнага саюза Алексіс Вітаньяк паведаміў, што ў сакавіку—красавіку гэтага года ў ЕДС будзе створаны спецыяльны сектар па аналізе сітуацыі ў Беларусі.

У выніковай заяве, якую падпісалі прадстаўнікі ўсіх партыяў, што ўзялі ўдзел у канферэнцыі, выказаная «сур'ёзная заклапочанасць сітуацыяй у Рэспубліцы Беларусь». У заяве зазначаецца, што «парушэнні правоў чалавека ў Беларусі набылі масавы характар» і што «рэжым Лукашэнкі ідзе на самаізаляцыю ў Еўропе».

Удзельнікі канферэнцыі выказалі салідарнасць «з дэпутатамі Вярхоўнага Савета В.Кудзінавым і А.Клімавым, а таксама з маладымі людзьмі В.Лабковічам, А.Шыдлоўскім і В.Кабанчуком, якія сталі ахвярамі палітычнага пераследу з боку рэжыму ў Беларусі».

Вадзім КАЗНАЧЭЕЎ

Шарамета – у лаўрэаты

Кіраўніцтва ОРТ вылучыла кандыдатуру Паўла Шарамета на атрыманне штогадовай расійскай тэлевізійнай прэміі «ТЭФІ» ў намінацыі «Лепшы рэпарцёр года».

Журы, якое ўзначальвае вядомы расійскі тэлежурналіст Уладзімір Познер, ужо прыступіла да прагляду каля дзесяці тысячаў відэакасет з матэрыяламі, прадстаўленымі на конкурс шэрагам тэлекампаніяў. Звычайна прэмія «ТЭФІ» прысуджаецца больш чым па 10 намінацыях і з'яўляецца ў Расіі вышэйшай прафесійнай узнагародай для тэлежурналістаў.

Як нам паведаміў Павел Шарамет, для яго самога вылучэнне ягонай кандыдатуры на атрыманне прэміі было прыемнай нечаканасцю. Павел разумее, што яму давядзецца супернічаць з лепшымі тэлерэпарцёрамі Расіі, аднак ён спадзяецца перамагчы і стаць першым прадстаўніком ОРТ — лаўрэатам «ТЭФІ» ў гэтай намінацыі. Раней лепшымі рэпарцёрамі неаднаразова прызнаваліся журналісты НТВ.

Альгерд НЕВЯРОЎСКІ

«Злосны хуліган» Лабковіч

У аўторак 16-гадовы мінскі школьнік Вадзім Лабковіч быў выпушчаны з-пад варты з прысудам 1,5 года ўмоўнага зняволення з выпрабавальным тэрмінам 2 гады за злоснае хуліганства. Гэтак суд пакараў Вадзіма за ўдзел у распісванні Стоўбцаў антыпрэзідэнцкімі лозунгамі, замену дзяржаўнага сцяга на бел-чырвона-белы і размалёўванне помнікаў Леніну і Дзяржынскаму. Сваё першае ў жыцці інтэрв'ю Вадзім ЛАБКОВІЧ даў нашай газеце.



Сябры падхапілі Вадзіма Лабковіча на рукі адразу, як ён выйшаў з суда. Фота С.Чырыка (Беларуская маладзёжная).

— Вадзім, ці спадзяваўся ты выйсці на волю? І ўвогуле, як ты ацэньваеш вынесены табе і Аляксею Шыдлоўскаму прысуд?

— Была мара пра волю, але ўпэўненасці не было. Разумеў, што ў мяне ёсць шанц — усё ж я непаўналетні, калі б мяне пасадзілі, гэта была б незмывальная пляма на твары рэжыму. Але на сумленні гэтага рэжыму ўжо столькі грахоў, паламаных лёсаў, што лёс яшчэ аднаго чалавека для іх нішто. Таму са мной магло быць тое ж, што з Аляксеем. Вельмі балюча, што яго няма цяпер побач. Вынесены яму прысуд — гэта вялікая несправядлівасць. Мы будзем змагацца за яго вызваленне.

— Табе самому дагэтуль пагражае турма. Каб цябе пасадзіць, дастаткова нават таго, што ты пяройдзеш вуліцу ў нявызначаным месцы.

— Не думаю пра гэта цяпер. Я рады, што бачу маці, браціка Валерку, бабулю, што побач сябры, проста ветлівыя твары, а не твары ахоўнікаў.

— Няўжо яны такія непрыемныя?

— За 6 месяцаў я пабываў у трох ізалятарах — Стаўбцоўскім, Жодзінскім і на Валадарцы ў Мінску. З большага ахоўнікі ставіліся да мяне нармальна, але ж вы павінны разумець, што нармальна — гэта па мерках ізалятара. Калі вам на вуліцы загадаць раптам: «Маўчаць! Рукі за спіну!» — як вы да гэтага паставіцеся? А ў турме такое абыходжанне — узор ветлівасці. Што аб'ядноўвала маіх турэмшчыкаў — гэта абсалютнае неразуменне, за што мяне арыштавалі. Яны рагаталі, калі дазнаваліся пра змест некаторых надпісаў, што мы пакінулі ў Стоўбцах.

— Пры тваёй упартасці ў турме ты проста павінен быў нарвацца на непрыемнасці.

— Мне дапамагала тое, што я «палітычны», ды яшчэ непаўналетні. А вось Аляксея Шыдлоўскага ў Жодзінскім СІЗО збівалі. Ён заяўляў пра гэта і падчас следства, і на судзе, але суддзя Лаўроў чамусьці ніяк не адрэагаваў. А тое, як збіваюць вязняў, я чуў ад сукамернікаў і нават сам назіраў. Падлеткаў выводзяць у калідор і б'юць рамянямі, дарослых — дубінкамі і кулакамі. Чапляюцца да нечага і б'юць. А хто іх пракантралюе?

— А да цябе чапляліся?

— Было адзін раз. У мяне пад матрацам знайшлася завостраная ручка ад кружкі. Дагэтуль не ведаю, хто з сукамернікаў яе падкінуў. Пакаралі мяне — пазбавілі перадачы, а маглі і ў карцэр адправіць. Але ў турме застацца без харчоў — рэч непрыемная.

— Дрэнна кармілі?

— Вада з бульбай ці нейкая незразумелая каша. А ў Жодзінскім СІЗО дык яшчэ і хлеб вельмі дрэнны.

— Ты, кажуць, захварэў?

— Сэрца стала ныць пастаянна. Страўнік баліць.

— Няўжо ніяк не лячылі?

— Якое турэмнае лячэнне?! Доктар дае табе дзве паловы адной таблеткі: гэтая палова ад галавы, гэтая — ад страўніка. Глядзі, не пераблытай...

— Бачу, ты шмат уражанняў атрымаў. А з кім давялося сядзець?

— Новых знаёмых хапіла. Толькі ў Жодзінскім СІЗО я змяніў восем камер. Там метода такая, усе «вандруюць». Сядзеў у асноўным з непаўналетнімі злодзеямі. Мяне цікавіла, чаму яны сталі красці. Высветлілася, што большасць крадзе не па прычыне прыродных схільнасцяў, а таму што жыць неяк трэба. Многія трапілі ў турму з-за гарэлкі, ужо без яе не могуць. Яшчэ нармальныя хлопцы, нават добрыя, а ўжо быццам атручаныя. Не пазайздросціш ім.

— Ты разважаеш, як чалавек з багатым жыццёвым вопытам. Гэта для цябе натуральна?

— Не зусім, канешне. Мне, праўда, даволі рана прыйшлося па-сапраўднаму дапамагаць маці, глядзець за малодшым братам. Але, відаць, гэта не галоўнае. Час напэўна такі.

— Якія твае бліжэйшыя планы?

— Паспрабую дагнаць праграму 11-га класа і скончыць школу разам з аднакласнікамі. А яшчэ трэба нешта рабіць, каб дапамагчы Аляксею. Гэта ж была мая ініцыятыва размаляваць Стоўбцы, таму я адчуваю сябе вінаватым і не супакоюся.

Гутарыў
Алег ГРУЗДЗІЛОВІЧ

Заробкі

Самымі высокааплатнымі ў 1997 годзе былі работнікі прадпрыемстваў трубаправоднага транспарту (іх заробак у 1997 годзе складаў 5,44 мільёна рублёў у месяц), а таксама банкаў, міжгаліновых органаў гаспадарчага кіравання і мытняў — у гэтых галінах заробкі ўдвая і больш разоў перавышалі сярэднія па краіне. У паўтара-два разы менш, чым сярэднестатыстычны працаўнік, атрымлівалі работнікі сельскай гаспадаркі, культуры і мастацтва, сацыяльнага забеспячэння.

Даўгі

За першы месяц 1998 года агульная сума запазычанасці па заработнай плаце дасягнула 953,6 мільярда рублёў, павялічыўшыся з пачатку года на 748,6 мільярда. 65% гэтага доўгу прыпадае на калгасы і саўгасы.

Пенсіі

Сярэдні памер пенсій у студзені 1998 склаў 1 млн. 238 тыс. рублёў — гэта толькі 65% ад велічыні мінімальнага спажывецкага бюджэту пенсіянера, разлічанага афіцыйнымі органамі.


БелаПАН

Шчукін паляпшае свой рэкорд

Паляванне на дэпутата Шчукіна, відаць, стала для сталічнай міліцыі стратэгічнай задачай

У сярэдзіне 80-х, пасля таго, як за кароткі тэрмін сканаў цэлы шэраг партыйных бонзаў, з'явіўся анекдот. На тэлеэкране — дыктар у чорным касцюме журботным голасам паведамляе: «Паважаныя таварышы! Вы, канешне, будзеце вельмі смяяцца, — але Канстанцін Усцінавіч Чарненка таксама памёр!» Дык вось, я ўжо не ведаю, смяяцца тут ці плакаць, — але дэпутата Валерыя Шчукіна зноў затрымалі!

Гэта адбылося ў аўторак, калі Шчукін разам з іншымі сустракаў каля будынка суда Вадзіма Лабковіча. Якому міліцэйскаму ці іншаму начальніку ў кемлівую галаву ўляцела арыгінальная думка, што сустрэчу вызваленага з-пад варты вязня можна прыраўняць да несанкцыянаванага сходу? На гэтае пытанне ў Ленінскім РАУС, супрацоўнікі якога ажыццявілі затрыманне, адказваць катэгарычна адмовіліся. Магчыма, гэта стане вядома падчас суда над Шчукіным, які адбудзецца 27 лютага. Акрамя «ўдзелу ў несанкцыянаваным мітынгу»,



Валерыя Шчукіна міліцыянты сілай зацягнулі ў машыну, схапіўшы яго каля будынка Мінскага абласнога суда. Фота С.Чырыка (Беларуская маладзёжная).

Шчукіну інкрымінуецца і «супраціўленне супрацоўнікам міліцыі». Апошняга, дарэчы, дэпутат не адмаўляе — па яго словах, ён сапраўды супраціўляўся, «таму што ніякіх падставаў для затрымання не было, бо не было ніякага сходу — і наогул дэкрэтам Лукашэнкі і рашэннем «палаты» я не падпарадкоўваюся, паколькі яны неканстытуцыйныя», — заявіў Шчукін.

Пасля суда, трэба думаць, агульная сума штрафаў, што «вісяць» на Шчукіне, яшчэ павялічыцца. Хаця і без таго яна з'яўляецца рэкорднай, і выплаціць яе Валерый Аляксеевіч не змог бы нават у тым выпадку, калі б у яго з'явілася такое дзіўнае жаданне.

Вадзім КАЗНАЧЭЕЎ

За падтрымку б'юць і штрафуюць

Схопленыя ў сераду каля будынка Мінскага абласнога суда, дзе праходзіў працэс над Лабковічам і Шыдлоўскім, сябры Маладога Фронту атрымалі штрафы ў некалькі мільёнаў рублёў.

21-гадовага студэнта Беларускага аграрна-тэхнічнага універсітэта Вадзіма Канапацкага суддзя Мінскага райсуда Царашкова выразала пакарань 5 мільёнамі рублёў толькі за тое, што, па словах двух сведкаў-міліцыянтаў, Вадзім прайшоўся па ганку Мінскага абласнога суда з закладзенымі за галаву рукамі. Маладафронтавец Віталь Алесіёнак аштрафаваны на паўтара мільёна.

Загадчыку канцыляры ўправы БНФ 50-гадоваму Уладзіміру Юхо, які спрабаваў заступіцца за хлопцаў і быў жорстка збіты амонаўцамі, уручана судовая павестка на 4 сакавіка. Дарэчы, сп.Юхо атрымаў у пракуратуры Ленінскага раёна сталіцы накіраванне на судмедэкспертызу, і лекары ўжо зафіксавалі шматлікія цялесныя пашкоджанні, якія нанеслі яму раз'юшаныя «ахоўнікі парадку». Юхо мае намер дамагчыся ўзбуджэння крымінальнай справы супраць гэтых міліцыянтаў.

Альгерд НЕВЯРОЎСКІ

Ліст чытача

Шаноўная рэдакцыя! Летась я быў сведкам, як у Мінску замазвалі лозунгі «Жыве незалежная Беларусь!» на вуліцы Арлоўскай. На той агароджы будаўнічай пляцоўкі засталіся брудныя плямы. Такія ж плямы можна назіраць і ў іншых месцах Мінска, дый не толькі сталіцы. Пад імі — замазаная любоў да Беларусі.

А вось іншыя надпісы, камбінацыі з трох і крыху больш літар, рознае хамства і брыдота часта застаюцца незафарбаванымі. Такі «вернісаж», напрыклад, знаходзіцца на праспекце Ракасоўскага, каля Дома інвалідаў. Гэтая «выстава» займае месца 15-20 метраў у даўжыню, стаіць там больш за два гады і пастаянна папаўняецца. Такое паскудства назіраюць сотні, нават тысячы людзей — і нікога гэта не хвалюе.

Супастаўляючы факты, я зрабіў для сябе адназначную выснову, што Шыдлоўскага і Лабковіча асудзілі за беларускі патрыятызм. Лозунгі тыпу «Бей волосатых!», што выдзяляюцца на той сцяне па праспекце Ракасоўскага, нікога не хвалююць. Тым часам лозунгі «Жыве незалежная Беларусь!» выклікаюць лютую злосць «інтэгратараў». Робім вывад: Беларусь любіць забараняецца, «бить волосатых» — можна. А лысых — таксама можна?

Я хачу выказаць салідарнасць з Шыдлоўскім, Лабковічам і Кабанчуком. Мужныя хлопцы падалі галасы ў абарону свайго ж, роднага. Менавіта гэта і выклікае ў мяне павагу. Я не хачу ацэньваць іхнія метады: у сённяшніх абставінах, магчыма, іншых метадаў не існуе.

Хачу, каб мяне зразумелі правільна: я не супраць дружбы нашай краіны з Расіяй. Я супраць халуйскага варыянта адносінаў.

Аркадзь АПАНАСЁНАК,
50 гадоў, г.Мінск

ДАГЕРРОТИП

Семен БУКЧИН

Человек у бортика

Где место белорусского правителя, раз уж он собственной персоной прибыл на Олимпиаду в Японию? Правильно: у бортика хоккейной площадки. Именно там, в спортивной шапочке, с шарфиком — ну чистый болельщик! Он должен непосредственно руководить полетом шайбы к вражеским воротам. Это другие президенты отсиживаются дома, а если и завернут на Олимпиаду, то как бы по пути, на пару часов изменив маршрут официального государственного визита.

А наш правитель, как известно, человек прямой и простой. Нет государственного визита, не приглашали к себе японцы? Ну и что? Даром что ли сделал Он себя председателем Национального олимпийского комитета? Самолет опять же свой! Денег, долларов этих самых, — как грязи. Так отчего бы и не захватить с собой десяток-другой верных людей, да и не пожить почти полмесяца в шикарных апартаментах в Нагано, не попытаться поруководить спортом, так сказать, в мировых масштабах? К следующей Олимпиаде такая халява может и не выпасть... Поэтому надо пользоваться случаем. Это, с одной стороны. Хотя есть и планы более масштабные...



Олимпиада принесла меньше медалей и радости, чем рассчитывал президент НОК. Теперь каждый должен получить свое: избранные — пряник, а большинство — кнутом, кнутом...

Отчет об этой славной командировке у него, Главного Олимпийца страны, никто, разумеется, не посмеет потребовать. Тем более, кому же неизвестно, что ездил Он не развлекаться, а работать. Изучать передовой спортивный опыт Японии. После чего, естественно, внедрять у себя будет. Потому что спорт — это самое главное в нашей жизни! Мы и вымираем, как народ, потому что мало спортом занимаемся. И вообще, спортсмены — это самые лучшие люди! В экономике. В дипломатии. В любой сфере! Спортсмену, ему ведь что важно? Хорошую установку дать! Дал правильную установку, и вот он уже пилит по лыжне, ни о чем другом не раздумывая. Спортсмен — человек приказа. Нерассуждающий. Поэтому Он так любит их.

В Нагано Главный Олимпиец Беларуси приобрел действительно бесценный опыт. Во-первых, Он лично убедился, как всесильна спортивная мафия. Это ведь она организовала плохую погоду для наших биатлонистов, заставив их все-таки бежать и стрелять. А когда увидела, что Его человеку светит золото, взяла да и прекратила соревнования. Ну скажите, в самом деле, разве *они* могут дать золото спортсмену, выступающему от имени Главного Интегратора белорусско-российского Союза? Да ни за что на свете!

А с другой стороны, враг явно прокрался в Его олимпийскую команду. Всего две бронзовые медали! Разве за этим он летел в Японию? А какие костюмы пошили для олимпийцев! Сколько деньжищ вбухали на их подготовку! Наконец, Его личный приезд — это ведь не хиханьки-хаханьки! Это обязывало, черт побери!

Конечно, доказать, что только две бронзовые медали — это результат совместного заговора Пазьняка, Богданкевича и Карпенко, — сложно. Но вот я лично думаю, что арестовать парочку-другую тренеров будет полезно. Народ как-то уже привык к арестам оппозиционеров, банкиров, журналистов, предпринимателей... Аресты в спортивной среде должны всем показать, что ни одна сфера жизни не остается без Его внимания. Собственно, Он еще в Нагано пообещал разобраться дома с кем надо... И теперь остается только выполнить обещание. Люди, которые поедут на следующую Олимпиаду, должны знать — либо медаль, либо наказание. Третьего не дано.

Сталин после проигрыша ЦСКА, кажется, в Югославии расформировал «команду лейтенантов». И что же после этого? Наш футбол только выиграл, стал еще лучше! Конечно, Сталину было обидно, что проиграли его врагу Тито. Наш Главный Олимпиец, безусловно, не враг императору Хирохито. Но авторитет-то главы государства нужно поддерживать! Ведь что сказано в Олимпийской Хартии? Что олимпийские соревнования — это не борьба стран и народов, а соперничество личностей. И вот Его личность оказалась в проигрыше. Кто-то должен ведь за это ответить! Конечно, кое-кто из недоброжелателей может сказать, что первейшую ответственность должен нести председатель Национального Олимпийского комитета. Выходит, Он должен сам себя наказать? Снять с должности, что ли?

Ну это уж дудки! Парочку-другую тренеров под суд — это неплохо, конечно, но жидковато... Нужен большой показательный процесс! Обязательно с участием оппозиции! Одна чистая сфера у нас оставалась — спорт, и туда уже грязные руки этих соросовских прихлебателей добрались!

«Всех — на рудники!» — эту крылатую фразу наш Главный Олимпиец произнес уже во Владивостоке, заслужив, как сообщает «Комсомольская правда», благодарные аплодисменты таможнего губернатора. Полагаю, что этот призыв следует толковать в максимально расширительном смысле. На этих самых рудниках и разным «дерьмократам», и плохим спортсменам, и тренерам место найдется.

Вообще в Приморье «человек у бортика», что называется, вошел в раж и его понесло. В «городе нашенском», на берегу бухты Золотой Рог, этого восточного рубежа империи, сердце забилось сильнее, голова закружилась, Он представил себя уже властителем необъятного пространства от Владивостока до Бреста и, соответственно, зазвучало-полилось: «Мы ведь русские люди!», «Наш флот!», «Мы занимаем одну шестую часть суши!»

А когда прибыл на крейсер «Варяг», вероятно, показалось, что это и не «Варяг», а сама «Аврора». И сейчас прозвучит залп... И вот Он под звон колоколов уже въезжает на белом «Линкольне» в Кремль.

А вы еще спрашиваете, зачем в Японию ездил, народные деньги тратил? Это сначала человек в шапочке стоит у бортика, команды хоккеистам подает, тренеров уму-разуму учит. И вот Он уже на палубе «Варяга»! И звучит под аплодисменты: «Мы — русские люди!» А с русскими людьми, да с нашим флотом на одной шестой части суши такие дела завернуть можно...

Власти нуждаются в объективной информации

Так считает профессор-социолог. У самих же властей, судя по их действиям, на сей счет иное мнение

Одной из главных составляющих внутренней политики белорусских властей стал неустанный поиск врагов. Дело депутата А.Климова — последнее тому подтверждение. Однако «врагами народа» становятся отнюдь не только политические противники режима. Общеизвестно негативное отношение властей к предпринимателям, можно сказать, как к классу. Многие независимые аналитики бьют тревогу из-за наступления государства на «третий сектор» (т.е. неправительственные организации, пусть даже лишенные политической направленности). О независимых СМИ и говорить нечего — определения «негосударственная» и «оппозиционная» в отношении прессы давно уже стали синонимами. То есть любая деятельность, не подпадающая под прямую зависимость от государства, а также любая свободная мысль воспринимаются диктатурой как нечто чуждое и враждебное.

Недавно в ряде белорусских государственных СМИ была развернута кампания против Независимого института социально-экономических и политических исследований (НИСЭПИ). Предметом кампании был доклад директора института Олега Манаева «Состояние и перспективы развития независимых СМИ в Беларуси». В общих чертах: Манаеву ставится в вину то, что он констатировал тяжелое материальное положение независимых СМИ в Беларуси и отметил, что они нуждаются в финансовой помощи. При этом — о, ужас! — в докладе профессора Манаева упоминается слово «бизнес-план», что, по мнению бдительной «Народной газеты», служит неоспоримым доказательством того, что «журналистское расследование» телепрограммы «Резонанс» насчет некоего мифического «бизнес-плана» оппозиции имеет под собой почву. Видимо, понятие «бизнес-план» в любом контексте вызывает отрицательный рефлекс.

С профессором Олегом МАНАЕВЫМ беседует наш корреспондент

— Почему ваш научный доклад стал объектом столь пристального внимания государства?

— На мой взгляд, прежде всего именно потому, что он сугубо научный. Многие говорят о том, что независимые СМИ, с одной стороны, находятся в тяжелом положении — а с другой стороны, пользуются определенным влиянием. Но одно дело, если это просто суждения, пусть себе и компетентных людей, а другое — результат научных исследований. Когда люди, структуры, группы, которые заинтересованы в поддержке независимых *mass-media* (на Западе, на Востоке или в нашей собственной стране), получают научно обоснованные аргументы — это звучит гораздо убедительнее. Научные исследования очень четко показывают, каким образом осуществляется давление на независимые СМИ, реальную роль независимых *mass-media* в Беларуси и другие аспекты.



Олег Манаев.

В частности, в моем докладе, содержавшем анализ результатов наших многочисленных исследований НИСЭПИ, было показано трудное положение, в котором оказались негосударственные СМИ в нынешней Беларуси. Доказывалось, что, несмотря на это, их влияние на белорусское общество, в отличие от многих государственных институтов, не уменьшается, а, наоборот, увеличивается. Причем, в отличие от большинства государственных, независимые СМИ формируют у своей аудитории демократическое, рыночное сознание, ориентированное на европейские стандарты жизни, а не на возврат в СССР. В заключительной части доклада предлагались рекомендации для международных организаций, заинтересованных в поддержке независимых СМИ в Беларуси.

Я хочу подчеркнуть, что доклад вовсе не рассылался «во многие демократические организации», как было указано в «Знамени юности». В полном виде он был передан только зарубежным коллегам, которые попросили меня его подготовить. На самом деле доклад был попросту выкраден (кем, думаю, догадаться нетрудно) и передан тем, кому поручили раскручивать «дело о заговоре». Доклад в целом написан для того, чтобы вся независимая демократическая пресса Беларуси получила международную поддержку.

— Однако именно за это ваш институт поставили чуть ли не на одну доску с политической оппозицией.

— Наш институт, как и большинство исследовательских центров, никогда не ставил перед собой политических целей. Но еще в советские времена постоянно использовалась следующая практика: если властям нравились результаты исследований — они мгновенно их использовали, широко публиковали и цитировали. Как только результаты противоречили линии власти — они клались под сукно, а исследователи подвергались гонениям. Ситуация не изменилась и сегодня. Известны факты, что когда результаты исследований НИСЭПИ, с точки зрения властей, были им на руку — они широко цитировались, нас приводили в пример как серьезных и объективных ученых. Сейчас, когда результаты «не в жилу» властям — они развязывают против нас вот такую кампанию. Это типичный подход, который используется по отношению не только к нам, но и к другим исследовательским центрам.

— В этом плане властям с независимыми центрами, конечно, сложнее, чем с государственными. Последним можно просто напрямую заказать удобные результаты.

— Да. Этот принцип остается таким же, как при коммунистическом режиме. Где же обществу черпать объективную информацию о своем собственном состоянии?

Любые власти, которые хоть немножко думают о будущем, должны быть заинтересованы в информации, которая отражает объективное положение дел, — в том числе и о настроении в умах граждан. Информация, которую руководство получает по своим каналам, определенным образом отфильтровывается, упаковывается и подается в том виде, в котором, по мнению разработчиков, это руководство хочет видеть мир. Но даже из чисто прагматических соображений власти должны владеть объективной информацией. Источников такой информации два: независимая пресса и независимые исследовательские центры. С этой точки зрения, помощь со стороны кого бы то ни было таким структурам — это не акт, направленный против существующей власти, а в каком-то смысле даже наоборот. Если власти, раскрывая газеты или аналитические бюллетени, получают информацию о положении дел, о болевых точках общества (которые могут разрастись в большие конфликты и причинить неприятности тем же властям), — они должны за это благодарить. Это поняли во многих постсоциалистических странах, в том числе и в России. Там государственные структуры финансируют независимые исследовательские центры, потому что заинтересованы в объективных исследованиях.

Вадим КАЗНАЧЕЕВ

НАВІНЫ
27 лютага 1998 г., № 19

Фронт за линией фронта

Из цикла «Частное мнение гражданина Старикевича»



Аббревиатура «БНФ» всегда вызывала ненависть у властей и очень часто глубокую неприязнь у других оппозиционных структур. На фоне рыхлых и беспомощных демократических партий Белорусский Народный Фронт выделялся склонностью к конкретным делам, а не только политическим заявлениям. По крайней мере, так обстояли дела до недавнего времени.

Прошлой весной именно Фронт посредством массовых уличных акций вывел белорусскую оппозицию из послереферендумного ступора. В результате организация ощутила приток свежих сил, в том числе интеллектуальной элиты, центром притяжения которой стал институт государственности и демократии. Пожалуй, самой удачной идеей, реализованной БНФ за последние годы, стало создание Молодого Фронта. Неотягощенная психологией аутсайдеров, зачастую свойственной белорусским оппозиционерам со стажем, молодежь придала новый импульс деятельности Фронта. Конечно, не стоит преувеличивать достаточно скромные успехи, но немаловажно то, что в определенный момент БНФ начал перехватывать политическую инициативу у президентской команды.

Власть почувствовала, что поверженный противник поднимается с колен. И засуетилась. В противовес Молодому Фронту создали Белорусский патриотический союз молодежи, на который угробили миллиарды бюджетных денег без сколь-нибудь существенной отдачи. В рядах БПСМ оказалась главным образом аполитичная часть студенчества, устремления которой ограничены спокойным окончанием учебного заведения. Пользы от таких членов для организации немного. Но надо отдать должное лидерам БПСМ: коньюнктуру они прочувствовали неплохо и возможность красиво пожить за казенный счет не упустили.

Тем временем июньский съезд БНФ засвидетельствовал единство в рядах движения, абсолютным большинством голосов подтвердив лидерские полномочия Зенона Пазьняка. Было заявлено, что Фронт берет на себя функции национально-освободительного движения. Делегаты разъехались, воодушевленные открывающимися перспективами.

С тех пор БНФ впал в состояние летаргической спячки, характерное для «объединенной оппозиции». За кратковременным всплеском последовал очередной провал. Фронт бессмысленно растратил очки, набранные весной.

Причины происшедшего следует искать в первую очередь внутри самого движения. Руководство БНФ раскололось на две группировки: «пазьняковцев», неформальным лидером которых является Вячеслав Сивчик, и «внутрипартийную оппозицию» во главе с Юрием Ходыко. Следствием их противостояния стал процесс постепенной потери управляемости организацией, который в обозримом будущем способен низвести БНФ до уровня карликовых партий.

История соперничества Пазьняка и Ходыко уходит корнями в начало девяностых. Но своего пика оно достигло два года назад. После того как Пазьняк оказался за пределами Беларуси, а Ходыко провел свою знаменитую тюремную голодовку, авторитет последнего вырос достаточно сильно. Сам он, не тушуясь, заявил летом 1996 года, что если Пазьняк в ближайшее время не вернется, то на его должность будет избран другой человек.

Внутрифронтовская оппозиция получила вполне прогнозируемую поддержку извне. Ходыко, в отличие от Пазьняка, все время соблюдавшего дистанцию даже от демократических партий, быстро навел мосты и с ОГП, и с «левыми». Как следствие, в негосударственных СМИ появились весьма лестные для зампреда БНФ публикации штатных пропагандистов прокоммунистических и либеральных структур, доселе в симпатиях к Фронту не замеченных. Профессора уверенно прочили в новые лидеры БНФ.

Что было дальше, хорошо известно. В белорусских условиях героические отсидки имеют обыкновение переходить в бесславное политическое существование. Нужно было доказывать обоснованность своих претензий на лидерство во Фронте реальными делами. Это как раз Юрию Ходыко и не удалось. Отмечу лишь тот факт, что и сам заместитель Пазьняка в конце концов осознал: первым номером ему не быть. Вылилось это в очень странную тираду, из которой следовало, что любые лидеры — это пережиток тоталитарного прошлого и молодой белорусской демократии они не нужны. Ну да ладно.

Вчистую проиграв Пазьняку на идейном уровне еще до начала вышеупомянутого съезда, Ходыко оружия не сложил и перешел к аппаратной борьбе. Вылилось это в обычные дрязги, которыми сейчас и поглощено руководство БНФ. Главный козырь группировки Ходыко в том, что на ее стороне выступает Левон Борщевский. К ней также примыкают еще один-два заместителя председателя БНФ (всего их шесть) и два секретаря Управы (из семи). Естественно, такой расклад открывает широкие возможности для самых банальных интриг.

Уж сколько раз было говорено о недопустимости в нынешней ситуации междоусобных разборок. Тщетно. Порождают их, чаще всего, люди, слишком слабые, чтобы бороться с режимом Лукашенко, и потому отыгрывающиеся на собственных соратниках. Реализовывать свои амбиции они готовы любыми средствами вплоть до потасовок. На одном из заседаний Центральной Рады Молодого Фронта уважаемый профессор буквально вырвал микрофон у Павла Северинца. Слава Богу, до мордобития дело пока не дошло.

Поэтому уже не вызывает удивления, когда Ходыко, характеризуя несимпатичных ему людей, прибегает к стилистике «Советской Белоруссии». Ерничанье по адресу «патриотов от молока матери» в устах заместителя председателя БНФ совершенно неуместно. Равно как и исполнение им на общественных началах функций адвоката Семена Шарецкого.

Но это так, к слову. Главная проблема заключается в том, что постоянное выяснение отношений в руководстве БНФ отнюдь не стимулирует деятельность организации. Вся энергия уходит на борьбу с «внутренними врагами». Разумеется, ни о какой сплоченности и проведении единой линии говорить в таких условиях не приходится.

Только одна иллюстрация к сегодняшней ситуации во Фронте. Как-то Пазьняк, узнав о том, что Свислочская Рада БНФ приняла решение об объединении с другими демократическими организациями своего района, потребовал его отмены. В результате в штаб-квартире Фронта проводили чуть ли не служебное расследование, чтобы выявить и наказать того, кто сообщил об этом факте руководителю движения.

Между тем, вопрос выбора союзников является одним из ключевых и полагаться в нем исключительно на принцип «вместе и батьку бить сподручнее» не стоит. Ясно выраженная позиция всегда выгодно отличала БНФ от других оппозиционных структур, которые за обширными программами прятали собственное неумение четко сформулировать основополагающие тезисы.

